танаі. Кіравакане, Адэсе і інш.). У 1949 зняты аднайменны мастацкі фільм па яго сцэнарыю. У 1967 г., праз 20 год пасля напісання п'есы, пісьменнік стварыў яе другі варыянт, сцэнічнае жыццё якому зноў даў тэатр імя Я.Купалы.

А.Маўзон – аўтар шматлікіх пастаўленых п'ес: «Наталля Крыўцова» (1954), «У ціхім завулку» (1955), «Непрымірымасць» (1956), «У бітве вялікай» (1957), «Калі ты чалавек» (1961), «Пад адным небам» (1962), «Куды ідзеш, Сяргей?» (1965), «У доме на Сонечнай» (1966), «Усяго адно жыццё» (1969), «Дарога праз ноч» (1970), «Білет у мяккі вагон» (1971), «Да апошняга дыхання» (апубл. 1978). Па сцэнарыях А.Маўзона на кінастудыі «Беларусьфільм» пастаўлены фільмы «Зялёныя агні» (1956) і «Наперадзе – крутыя паварот» (1960). Творы драматурга адлюстроўваюць гераічныя падзеі гісторыі краіны, раскрываюць духоўны свет чалавека. А.Маўзонам напісаны і творы малога жанру, у прыватнасці аднаактоўкі. У перыядычным друку выступаў з артыкуламі і рэцэнзіямі па пытаннях драматургіі і сучаснага тэатра, з нарысамі, фельетонамі і інш. П'есы ставіліся амаль ва ўсіх драматычных тэатрах Беларусі, у тэатрах Расіі і за мяжой; перакладаліся на грузінскую, украінскую, балгарскую, карэйскую, польскую, чэшскую і іншыя мовы. А.Маўзон аўтар зборнікаў: «Выбраныя п'есы» (1964), «Людзі і час» (1972), «П'есы» (1974, 1978), «Да апошняга дыхання» (1985). Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Памёр А.Маўзон 19.8.1977 г., пахаваны ў Мінску на Паўночных могілках. Яго імем названа вуліца ў Віцебску.

**МАЦВЕЕЎ Уладзімір Аркадзевіч**. Беларускі вучоны ў галіне інфекцыйных хвароб і педыятрыі. Нарадзіўся 13.3.1956 г. Доктар медыцынскіх навук, прафесар (1997). Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1979), у 1982–2002 гг. працаваў у ім. Навуковыя працы па цытамегалавіруснай інфекцыі, імунапатагенезе, клінічнай імуналогіі, інфекцыйных хваробах дзяцей.

**МІРЫНГОФ Залман Ісаакавіч**. Беларускі мастак-жывапісец. Нарадзіўся ў 1903 г. Скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум, Акадэмію мастацтваў у Ленінградзе. Працаваў як партрэтыст і пейзажыст. Удзельнічаў у «Восеньскай выставе мастацтваў БССР» (1936), выставе «БССР за 20 гадоў» (1937), «Усебеларускай выставе выяўленчага мастацтва» (1940). З 1937 г. жыў у Мінску. Перад самым пачаткам Вялікай Айчыннай вайны атрымаў заказ на партрэт І.В.Сталіна, які павінен быў упрыгожыць Цэнтральную плошчу Мінска ў час святкавання гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі 7 лістапада 1941 г. З-за гэтай карціны яго не мабілізавалі, а сам ён не рашыўся эвакуіравацца. Загінуў у Мінскім гета.

*А.Л.Шульман.*

**МОРХАТ Віктар Іосіфавіч**. Беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі. Нарадзіўся 2.2.1959 г. Доктар медыцынскіх навук, прафесар. Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1982). Працуе загадчыкам кафедры афтальмалогіі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта. Аўтар 62 навуковых і метадычных прац. Мае 2 аўтарскія пасведчанні, патэнты на вынаходніцтвы, 32 рацыяналізатарскія прапановы. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі 1988 г. Узнагароджаны значком «Вынаходнік СССР».

**МЯДЗВЕДСКІ Яўген Нікандравіч**. Беларускі вучоны ў галіне отарыналарынгалогіі. Нарадзіўся 25.12.1918 г. Кандыдат медыцынскіх навук (1966). Заслужаны ўрач Беларусі (1968). Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1978). Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. галоўны ўрач паліклінікі, загадчык раённага, гарадскога, абласнога аддзелаў аховы здароўя ў Віцебску. У 1954–90 гг. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце (у 1965–79 рэктар). Навуковыя працы па абязбольванні пры аперацыях на верхніх дыхальных шляхах і вусе, эпідэміялогіі злаякасных новаўтварэнняў, прафілактыцы ангін, хранічнага танзіліту і інш. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

**НІКАЛАЕЎ Аляксандр Аляксандравіч**. Беларускі вучоны ў галіне паталагічнай анатоміі. Нарадзіўся 9.4.1925 г. Доктар медыцынскіх навук (1976), прафесар (1978). Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут (1952). З 1956 г. ў Віцебскім медыцынскім універсітэце (у 1965–90 загадчык кафедры). Навуковыя працы па марфалогіі пухлін; па парэнхіматозна-страмальных узаемаадносінах, эпідэміялогіі і марфагенезе пухлін шчытападобнай залозы і страўніка. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, значкамі «Выдатнік аховы здароўя Беларусі» і «Выдатнік вышэйшай школы Беларусі», Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі.